Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 4 (655) Пятніца, 27 студзеня 1967 года. Год выдання XX. Цана 2 кап.

УНІВЕРСІТЭТ ГАНАРЫЦЦА ІМІ



ДЛЯ ЯГО ФАКУЛЬТЭТ— ЖЫЦЦЁ

НАШ ДЭКАН — ардэнаносец! — гэтая радасная вестка вельмі хутка распаўсюдзілася па факультэту. Кожны адчуваў сябе імяніннікам, бо належаў да калектыва, якім вось ужо два дзесяцігоддзі кіруе Павел Рыгоравіч Пятровіч.

Асабіста я не уяўляю сабе іншага дэкана. Калі ў 1955 годзе спазнілася на першую ў сваім жыцці лекцыю, мяне спыніў спакойны голас Паўла Рыгоравіча:

— Вас прыдзецца выключыць з ліку студэнтаў, калі працяг будзе такім жа, як пачатак...

Пасля такога знаёмства я не адважылася за пяць год студэнцтва паўтарыць няўдалы пачатак. Пасля даведалася, што наш дэкан не такі суровы, як гэта можа здацца. А яшчэ пазней я ўбачыла Паўла Рыгоравіча Пятровіча на адным з факультэцкіх вечароў. Гэта быў тады самы вясёлы сярод нас чалавек.

Так, наш дэкан можа быць строгім, нават злосным, калі сутыкнецца з недысцыплінаванасцю і безгаспадарчасцю. Але часцей ён бывае іншым: дзелавітым, сканцэнтраваным і надзвычай чулым да кожнага чалавека.

Няма патрэбы напамінаць, колькі самых розных спраў у кіраўніка факультэта. У нашага Паўла Рыгоравіча іх асабліва шмат, бо лік студэнтаў і выкладчыкаў расце з кожным годам, а плошча для заняткаў застаецца усё той жа. Толькі дзякуючы старанным намаганням свайго дэкана, біёлагі паспяваюць ісці за ўсё узрастаючымі патрабаваннямі.

Кабінет нашага дэкана не закрываецца. Туды ідуць людзі, каб высветліць розныя пытанні, асабістыя і факультэцкія. І усе яны выносяць адтуль, часцінку энергіі Паўла Рыгоравіча і цвёрдую ўпэўненасць у тым, што факультэт для яго— гэта жыццё, гэта гонар яго, яго радасць.

Памятаю, некалькі гадоў назад на дзвярах дэканата вісела шыльдачка, на якой былі распісаны дні і гадзіны прыёма наведвальнікаў. Нядоўга, аднак, яна правісела: Павел Рыгоравіч знішчыў шыльдачку, а з ёй і чаргу ў свой кабінет.

Неяк мы спрабавалі распісаць па мінутах рабочы дзень нашага Паўла Рыгоравіча. Гэта аказалася справай нялёгкай, тым больш, што дробных спраў у дэкана не існуе. Выявілі толькі, што працоўны дзень Паўла Рыгоравіча цягнецца 10—14 гадзін. Зразумела, мы не падазравалі, што гэта лічба заніжаная. Дацэнт Пятровіч у дадатак да ўсяго вядзе вялікую педагагічную і навуковую работу, якой ён вымушан часам займацца вечарамі, начамі. Тады яго кватэра нагадвае лабараторыю.

Мне вельмі прыемна, карыстаючыся выпадкам, павіншаваць Паўла Рыгоравіча з высокай узнагародай Радзімы—ордэнам Леніна.

Н. БАТУРЫЦКАЯ.
аспірантка біялагічнага факультэта.

З УЗНАГАРОДАЙ, ТАВАРЫШЫ!

Нядаўна Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР за заслугі ў развіцці вышэйшай спецыяльнай і сярэдняй адукацыі, у падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі і дасягнутыя поспехі ў навуковых даследаваннях ўзнагародзіў ардэнамі і медалямі вялікую групу работнікаў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Сярод узнагароджаных—прадстаўнікі Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Ордэна Леніна ўдастоен кандыдат біялагічных навук, дэкан біялагічнага факультэта, дацэнт Павел Рыгоравіч Пятровіч.

Доктар філалагічных навук прафесар Любоў Іванаўна Фіглоўская і доктар філасофскіх навук, загадчык кафедры гісторыі КПСС Усевалад Міхайлавіч Сікорскі ўзнагароджаны ардэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга. Уклад доктара навук прарэктара нашага універсітэта Леаніда Вікенцьевіча Валадзько ў падрыхтоўку кваліфікаваных спецыялістаў і навуковыя даследаванні адзначаны медалем «За працоўную доблесць».

Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» сардэчна віншуе П. Р. Пятровіча, Л. І. Фіглоўскую, М. У. Сікорскага, Л. В. Валадзько з узнагародамі і жадае ім новых поспехаў на карысць Радзімы.

САРДЭЧНЫЯ ВІНШАВАННІ ПРАФЕСАРА

Адбылося пашыранае пасяджэнне Вучонага Савета універсітэта, прысвечанае 60-годдзю з дня нараджэння і 35-годдзю навуковай дзейнасці доктара філасофскіх навук загадчыка кафедры гісторыі філасофіі і логікі, прафесара І. М. Лушчыцкага. Пасяджэнне адкрыў цёплым уступным словам прарэктар Л. В. Валадзько. Пад бурныя апладысменты ён зачытаў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб узнагароджанні юбіляра Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. Пасля Івана Мікалаевіча сардэчна віншавалі ад імя рэктарата, парткома і мясцкома універсітэта дацэнт Т. Я. Дударава, прадстаўнікі факультэтаў, загадчыкі кафедраў, а таксама госці з вышэйшых навучальных устаноў Мінска, абласных цэнтраў рэспублікі, Масквы. Затым юбіляру былі ўручаны памятныя адрасы і шмат кветак.

Студзень... У гэтым месяцы наш універсітэт жыве асабліва напружана. Акрамя студэнтаў стацыянара і завочнікаў, сесію здаюць і студэнты-вячэрнікі. На здымку вы бачыце Б. Барысава, які задумаўся над пытаннямі білета (злева) і выкладчыка А. А. Шынгеля.

КЛІЧУЦЬ ЗІМОВЫЯ ТРАСЫ

У той час, як у завочнікаў толькі пачалася экзаменацыйная сесія, у студэнтаў стацыянара яна закончылася. Прыкметна апусцелі аўдыторыі, інтэрнаты, бібліятэкі. У іх засталіся хіба толькі тыя, хто з году ў год ледзь-ледзь пераходзіць з курса на курс, дый то з адным ці двума хвастамі. Ім не да канікул...

Для студэнтаў, што старанна працавалі на працягу семестра, на выдатна і добра здалі экзамены, партком, рэктарат, камітэт камсамола, мясцком падрыхтавалі выдатны адпачынак. З 23 студзеня па 7 лютага будзе праведзена шмат самых розных спартыўных мерапрыемстваў. Асабліва многа студэнтаў накіруецца ў лыжны турысцкі паход па месцах баявой і працоўнай славы савецкага народа, прысвечаны пяцідзесяцігоддзю Кастрычніка.

Лепшыя лыжнікі універсітэта будуць удасканальваць сваё спартыўнае майстэрства на вучэбна-трэніровачных зборах. Штодзённыя шматкіламетровыя забегі дадуць магчымасць выявіць лепшых лыжнікаў вну, якія неўзабаве будуць абараняць гонар універсітэта на маючай адбыцца зімовай прафсаюзнай спартакіядзе. Добрым эліксірам здароўя для студэнтаў будуць таксама штодзённыя турысцкія паходы за горад.

Радуюць поспехі нашай зборнай па баскетболу. Калектыў дружна і напружана рыхтуецца да баёў з прадстаўнікамі Саратаўскага універсітэта, якія адбудуцца другога-трэцяга лютага.

У вострых спартыўных паядынках правядуць канікулы аматары лёгкай атлетыкі. Некаторыя з іх прымуць удзел у першынстве рэспублікі па лёгкай атлетыцы ў Брэсце. Многім пашчасцівіцца пабываць у турысцкіх падарожжах па цудоўных мясцінах Карэліі, Урала, Закарпацця і многіх іншых раёнаў.

Набівайце тужэй свае рукзакі, таварышы, у паход і каб вярнуліся адтуль жыццярадаснымі, з добрым, бадзёрым настроем зноў узяліся за вучобу.

І. КУЗЬМІН.

ДЭЛЕГАЦЫЯ З КАЛУМБІІ

З кожным годам ўсё больш і больш пашыраецца аўтарытэт Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна як у нашай краіне, так і за мяжой. Выдатныя карпусы, светлыя аўдыторыі, навейшае абсталяванне ў навукова-даследчых лабараторыях і кабінетах выклікаюць сапраўднае захапленне ў тых, хто наведвае наш універсітэт. Таму не дзіўна, што маладзёжныя арганізацыі з замежных краін—частыя госці нашых студэнтаў. У нас пабывалі студэнты з Польшчы, Чэхаславакіі, ГДР, МНР, Францыі, Аўганістана, Гватэмалы, Коста-Рыка, Англіі, ФРГ і многіх іншых краін свету.

20 студзеня ў нашым універсітэце была цёпла сустрэта дэлегацыя Калумбіі. Больш трох гадзін госці знаёміліся з нашым універсітэтам. Пасля адбылася цікавая гутарка, з якой яны даведаліся аб пастаноўцы навучальнага працэсу БДУ, працы студэнцкіх самадзейных арганізацый, падрыхтоўцы і размеркаванні спецыялістаў. З свайго боку калумбійцы расказалі аб жыцці і вучобе студэнцкай моладзі іх краіны.

А. ЮР'ЕЎ.

У гэтыя дні асабліва мнагалюдна ва універсітэце. Не паспелі яшчэ здаць экзамены ўсе студэнты стацыянара, а ўжо на сваю справаздачу прыехалі завочнікі, тыя, хто спалучае вучобу з працай на прадпрыемствах, установах, калгасах і саўгасах.

Гэтыя старонкі прысвячаюцца жыццю і вучобе завочнікаў. Некаторыя матэрыялы падрыхтаваны імі самімі. Жадаем усім студэнтам папоўніць свае веды на лекцыях і практычных занятках, а за лікоўкі — выдатнымі і добрымі адзнакамі.

ПАДКАЗАНА ВОПЫТАМ

Кожнаму завочніку трэба памятаць, што параўнаўча кароткі тэрмін сесіі неабходна выкарыстаць таксама для таго, каб уважліва праслухаць курс лекцый, запасціся планам семінараў, вучэбнымі дапаможнікамі і старанна рыхтаваць дысцыпліны, па якіх вясной пачнуцца семінарскія заняткі. Практыка даўно паказала, што паспяховае выкананне вучэбнага плана па курсу гісторыі КПСС, напрыклад, у значнай ступені залежыць ад таго, як студэнт будзе працаваць над першакрыніцамі і падручнікамі на працягу ўсяго навучальнага года. Добрым спадарожнікам поспеху з'яўляецца таксама шматграннае веданне сучаснай палітыкі; для гэтага, вядома, трэба рэгулярна чытаць перыядычныя выданні. Лепшыя студэнты, менавіта, так і паступаюць. Але прыходзіцца сустракацца з такімі фактамі, калі студэнт, нічога не рыхтаваўшы, нават не ведаючы, што яму здаваць, прыязджае на сесію. Канешне, яго чакаюць правалы.

У мінулым годзе я працаваў са студэнтамі другога курса гістарычнага факультэта і першага курса філалагічнага. Большасць завочнікаў рэгулярна наведвала лекцыі, канспектавала іх, актыўна ўдзельнічала ў субяседаваннях на семінарскіх занятках. Дадатны прыклад у гэтым паказалі гісторыкі. Але з боку некаторых студэнтаў, асабліва філолагаў (аддзяленне беларускай мовы і літаратуры, журналістыкі), можна заўважыць, што яны яшчэ недаацэньваюць лекцыі і нават семінары. Гэта прывяло да таго, што на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры каля 20 працэнтаў студэнтаў не здалі экзамены з першага заходу.

З мэтай паляпшэння вывучэння курса гісторыі КПСС наша кафедра падрыхтавала шэраг практычных указанняў выкладчыкам па паляпшэнню метадычнай работы сярод студэнтаў-завочнікаў. Напрыклад, падрыхтавана і зацверджана тэматыка лекцый і практычных заняткаў па ўсяму курсу. Для работы на завочным факультэце прыцягнуты лепшыя выкладчыкі, якія замацаваны за групамі. У кабінеце гісторыі КПСС арганізавана дзяжурства членаў кафедры для кансультацый завочнікаў. Метадычныя пытанні выкладання прадмета запланавана сістэматычна абмяркоўваць на секцыях кафедры. Сіламі выкладчыкаў-гісторыкаў рыхтуецца вучэбны дапаможнік для студэнтаў другога курса.

Задача калектыва кафедры і студэнтаў-завочнікаў — прыкласці ўсе намаганні, каб яшчэ больш павысіць узровень вывучэння гісторыі КПСС і першакрыніц класікаў марксізма-ленінізма.

А. А. ФІЛІМОНАЎ,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі КПСС.

ПЕРАД ЭКЗАМЕНАМ. Фота А. КАДЗЕТА.

ГРУНТОЎНА ВЕДАЦЬ ЗАМЕЖНУЮ МОВУ

У наша стагоддзе, стагоддзе бурнага развіцця тэхнікі, як ніколі неабходна веданне замежных моў. Асабліва гэта важна для спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Падлічана, што з кожным годам паток інфармацыі падвойваецца, і ніякая колькасць перакладчыкаў-спецыялістаў не можа справіцца з перакладам замежнай літаратуры, якая паступае да нас усё ў большым і большым аб'ёме. Самым простым і правільным выхадам з гэтага было б, на думку многіх лінгвістаў, веданне хоць бы адной мовы выпускніком вну. Гэта дало б магчымасць намнога пашыраць свае веды ў галіне навейшых навуковых адкрыццяў па сваёй спецыяльнасці.

Практычныя веды замежнай мовы — паняцце шырокае. Яно ўключае ў сябе веды кожнага з аспектаў мовы — вуснага чытання, перакладу, пісьма, правільнага вымаўлення. Навучанне студэнтаў-завочнікаў у такім аб'ёме было б па многіх прычынах не мэтазгодным. Зыходзячы з гэтага, галоўная ўвага звяртаецца на чытанне і пераклад спецыяльнай літаратуры, у тым ліку і палітычных тэкстаў. Гэта дае магчымасць студэнтам у поўнай меры праявіць свае здольнасці ў самастойнай працы над мовай. Не трэба лічыць, што студэнты-завочнікі ўвогуле не атрымліваюць ніякіх кансультацый па перакладах. Мы ім дапамагаем, але не ў такой ступені, як студэнтам стацыянара. Вядома, што завочнікі ў першую чаргу арыентуюцца на авалоданне чытаннем і перакладамі. Праца над засваеннем вуснай мовы ў асноўным зводзіцца да шасці вусных тэм, па якіх студэнты павінны умець весці размову з выкладчыкам ці са сваімі таварышамі-аднакурснікамі.

Ёсць вядомая ісціна: каб навучыцца таварыць, трэба таварыць. Улічваючы невялікую колькасць часу на практычныя заняткі, і як вынік — амаль поўную адсутнасць моўнага асяроддзя, перад завочнікамі не ставіцца задача умець размаўляць, напрыклад, на нямецкай мове. Веданне вусных тэм напамяць садзейнічае выпрацоўцы ў студэнтаў некаторага вопыту правільнага вымаўлення і пабудовы сказаў. Трэба адзначыць, што большасць завочнікаў авалодваюць таксама навыкамі гутарковай мовы. Пры жаданні гэтага могуць дасягнуць усе студэнты.

А. КАЦНЕЛЬСОН,
выкладчык кафедры нямецкай мовы.

ВУЧОБА ПАТРАБУЕ ПРАЦАВІТАСЦІ

Вышэйшая школа адыгрывае выключна важную ролю ва ўсебаковым развіцці чалавека, падрыхтоўцы яго да высокакваліфікаванай працы. Таму Камуністычная партыя ставіць сваёй задачай зрабіць як мага больш даступнымі ўсе формы вышэйшай адукацыі. За апошнія гады хуткае развіццё ў нашай краіне атрымала завочная адукацыя.

На завочным факультэце Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна вучыцца 4482 студэнты. Дзесяць гадоў назад завочным навучаннем было ахоплена 2792, а ў 1946 годзе — усяго 525 чалавек.

Цяпер у завочнікаў гарачая пара — пачалася зімовая лабараторна-экзаменацыйная сесія. Рэктарат, кафедры, дэканат завочнага факультэта правялі вялікую работу па падрыхтоўцы да яе. Большасць кафедраў абмеркавала на пасяджэннях вынікі летніх экзаменаў і вызначыла шмат канкрэтных мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне вучобы завочнікаў. Асабліва многа ў гэтым напрамку зрабілі кафедры тэарэтычнай механікі, гісторыі КПСС, філасофіі і логікі, гісторыі новага і навейшага часу, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, фізгеаграфіі СССР, угалоўнага працэса і крыміналістыкі, крымінальнага права, тэорыі дзяржавы і права, беларускай мовы, беларускай літаратуры, рускай мовы, гісторыі рускай журналістыкі, фізіялогіі раслін, гісторыі СССР, нямецкай мовы, педагогікі і псіхалогіі. Некаторыя кафедры паклапаціліся таксама аб выданні спецыяльных вучэбных дапаможнікаў і шэрагу метадычных распрацовак.

Да вучэбнай работы з завочнікамі ў нас прыцягнуты найбольш кваліфікаваны прафесарска-выкладчыцкі калектыў, што дало магчымасць намнога скараціць колькасць выкладчыкаў-пагадзіннікаў.

У гэтым годзе дэканат звярнуў вялікую ўвагу на работу з завочнікамі ў міжсесійны перыяд. Так, для сістэматычнага правядзення кансультацый, а таксама датэрміновай здачы экзаменаў і залікаў па просьбе студэнтаў быў устаноўлен дзень завочніка.

Узмацнілася таксама сувязь дэканата завочнага факультэта з прадпрыемствамі і арганізацыямі, у якіх працуюць студэнты. Нярэдка дэканат высылаў на імя кіраўнікоў устаноў хадатайніцтва з просьбай стварыць для студэнтаў неабходныя ўмовы для вучобы.

Праведзеная работа садзейнічала павышэнню якасці засваення вучэбнага матэрыяла завочнікамі, іх больш цеснай сувязі з універсітэтам. Паспяховасць студэнтаў па вынікаў летняй сесіі ў цэлым добрая. Нядрэнныя вынікі ў вучобе паказваюць студэнты Н. В. Драбушэвіч (5 курс аддзялення беларускай мовы і літаратуры), І. М. Шчурко (4 курс аддзялення біялогіі), П. Л. Селязнёў (5 курс біялогіі). Спіс можна працягваць і далей. Гэта людзі, якія, нягледзячы ні на якія цяжкасці ў вучобе і працы, настойліва змагаюцца за веды, штодзённа павышаюць сваю кваліфікаванасць. Іх поспехі радуюць нас.

Але ў цэлым падрыхтоўка спецыялістаў шляхам завочнага навучання яшчэ адстае ад ўзрастаючых запатрабаванняў. Нам яшчэ шмат намаганняў трэба зрабіць для таго, каб палепшыць навучальны працэс, рыхтаваць больш кваліфікаваныя кадры. Чаго, як кажуць, граха таіць, цяпер самай распаўсюджанай адзнакай на экзаменах завочнікаў з'яўляецца «здавальняюча».

Пакуль што мы маем вялікі адсеў студэнтаў за акадэмічную непаспяховасць.

Прычынай непаспяховасці з'яўляецца ў першую чаргу тое, што многія студэнты мала займаюцца дома, прыязджаюць на сесію недастаткова падрыхтаванымі.

Студэнты, якія не здалі залікаў і экзаменаў у перыяд сесіі, згодна існуючаму палажэнню павінны ліквідаваць акадэмічную запазычанасць не пазней, як праз два тыдні. Аднак не ўсе выконваюць гэтыя патрабаванні. Дэканату прыходзіцца неаднаразова напамінаць ім аб неабходнасці ліквідавання «даўгоў». І толькі пасля таго, як непаспяваючыя студэнты атрымліваюць выпіскі з загада рэктара аб выключэнні іх з універсітэта, у дэканат ідуць людзі з просьбай аб аднаўленні іх на вучобу.

Непрыемным з'яўляецца і такі факт, што многія студэнты спісваюць кантрольныя і курсавыя работы з кніжак, брашур ці прац сваіх «добрых» сяброў-старшакурснікаў. Часта парушаюцца тэрміны выканання заданняў.

Вядома, выкладчыкі не могуць праверыць своечасова тыя работы, якія паступілі перад самай сесіяй ці нават пасля яе пачатку.

Нягледзячы на значнае паляпшэнне рэцэнзіравання кантрольных работ, у гэтай справе ўсё яшчэ не ліквідаваны недахопы. Ёсць выкладчыкі, якія несістэматычна бяруць паступаючыя кантрольныя работы, адкладваюць, пакуль іх назбіраецца многа, а затым затрымліваюць час праверкі.

Трэба зазначыць таксама, што некаторыя кафедры недастаткова ўдзяляюць увагу арганізацыі і правядзенню ўліку вучэбнай нагрузкі і кантролю за ходам навучальнага працэсу, не праводзяць узаемнаведвання лекцый і практычных заняткаў.

Немалаважнае пытанне, якое паўстае перад кожным завочнікам, калі ён прыязджае на сесію, займае бытавая праблема. У гасцініцах завочнікам месц не прадастаўляюць, забяспечыць жа ўсіх інтэрнатам універсітэт таксама не можа. Хацелася б, каб адміністрацыйна-гаспадарчая частка больш уважліва і аператыўна вырашала бытавыя пытанні.

Да таго ж, многія студэнты ў час сесіі вядуць сябе непрыстойна, парушаюць правілы ўнутранага распарадку, які ўстаноўлены ва універсітэце.

У рашэннях XXIII з'езда КПСС вучэбна-выхаваўчай рабоце са студэнтамі ўдзяляецца вялікая ўвага. Дэканат, прафесарска-выкладчыцкі калектыў завочнага факультэта прыкладуць усе свае старанні для таго, каб рыхтаваць высокакваліфікаваных і ўсебакова развітых спецыялістаў.

В. Г. ІВАШЫН,
дэкан завочнага факультэта.
В. С. БАГДАНАЎ,
намеснік дэкана завочнага факультэта.

«ЛЁГКІ ЗАЛІК»

Вядома, для таго, каб здаць экзамен ці залік, трэба, кажучы словамі студэнтаў, доўга пакарпець над падручнікам, заканспектаваць галоўнае, да драбніц абдумаць кожнае пытанне. Так робяць усе студэнты. А вось трэцякурснік геаграфічнага аддзялення В. А. Крэсло вырашыў пайсці па больш лёгкаму шляху: не сядзець над падручнікамі, ні чым не «марочыць» сабе галавы. Доўга не думаючы, ён дастаў сваю залікоўку, паставіў сам сабе залік і спакваля падцвердзіў яго подпіс выкладчыка нямецкай мовы Хурсік. Усё было зроблена, як кажуць, так, што камар носа не падточыць, чыста і гладка. Але хіба шыла ў мяшку схаваеш?

Каб выкрыць гэтае «мудрагелістае» махлярства выкладчыку і дэкану не прышлося доўга ламаць галаву. Бо як гэта чалавек, які не трымаў у руках кніжкі, з такім поспехам здаў залік?!

Сам сабой напрашваецца вывад: ці месца таварышу Крэсло сярод тых, хто старанна і напружана авалодвае ведамі, з вялікай адказнасцю рыхтуецца да кожнай сесіі?

В. СЕРДЗЮКОЎ.

НАРЫС

ЧАЛАВЕК З КІНАКАМЕРАЙ

Яго часта можна сустрэць і на мнагалюдных вуліцах горада, і на новабудоўлях, і на калгасных палетках, і сярод шахцёраў. Яго працоўны дзень не нарміраваны. Ён можа цэлую ноч трэсціся ў «газіку», каб ранкам быць там, дзе адбудзецца падзея, то з адменнай зухаватасцю альпініста ўзбірацца на горныя вяршыні або падобна адмысловаму аквалангісту, апускаецца ў марскія глыбіні... І заўсёды ў яго руках камера. Гэта кінааператар-дакументаліст. Поплеч з ім заўсёды знаходзіцца асістэнт — яго памочнік, кансультант, бескампрамісны крытык і заступнік. Гэта чалавек, які ад прыроды, прынамсі, павінен мець два таленты: інжынера і мастака. Цяжка сказаць, які пачатак павінен перамагаць у ім — эстэтычны ці тэхнічны. Тое і другое, як дзве рукі, два вокі, неабходны для яго. У дадатак да ўсяго асістэнт павінен заўсёды мець бадзёры, жыццярадасны настрой, кемлівасць, шырокую фантазію...

Не злічыць у фільматэках каробак з маркай «Мінская кінастудыя». У іх захоўваюцца кінастужкі — своеасаблівы расказ аб дарогах, па якіх прайшлі вялікія жыццялюбы, людзі з няўтаймаванымі сэрцамі, з нявычарпальнай любоўю да сучаснікаў, краіны. Многія з іх закончылі наш універсітэт, некаторыя яшчэ вучацца.

У асістэнта-аператара Анатоля Алая гэтая зімовая сесія на аддзяленні журналістыкі — першая ў жыцці.

...Ён не спаў да поўночы. Думкі адна за адной снавалі ў яго галаве. Ён будзе самастойна весці здымкі. Адзін. Без шэфа. Даручэнне як быццам простае: сустрэцца з чалавекам у загадзя ўмоўленым месцы, устанавіць асвятляльныя прыборы, падключыць акумулятар да кінакамеры, вызначыць дыяфрагму — і нажаць на кнопку.

Ва ўсякай прафесіі ёсць такі першы самастойны крок. Анатоль прыпамінаў іх і адчуваў, што не больш спакойна было на душы тады, калі першы раз садзіўся за абаранак аўтамабіля, праводзіў выпрабаванні новага асцылографа ў санэпідстанцыі, дзе працаваў тэхнікам.

Заўтра адбудзецца яго сустрэча з сапраўднай марай...

Беленькі, чысцюткі снег мітусіцца перад вачыма. На полі — ні парушынкі. Яно ззяе тысячамі рознакаляровых іскраў. Удалечыні вызначаюцца межы. І гэта ўжо не поле, а белы вялізны экран. Пачынаецца сон, добры, прыемны...

Назаўтра ён быў на здымцы. Яна цягнулася паўтары гадзіны... Па шчыраму поціску рукі шэфа, па вясёлых усмешках таварышаў, Анатоль зразумеў: заданне выканана выдатна. Гэта быў першы крок да прызнання.

Працуючы асістэнтам у кінааператара вышэйшай катэгорыі заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Уладзіміра Паўлавіча Цеслюка, Анатоль прымаў удзел у стварэнні не толькі кіначасопісаў, рэкламных ролікаў, але і поўнаметражных дакументальных фільмаў.

З кожнай новай работай удасканальваецца яго майстэрства, больш строгімі становяцца запатрабаванні да сябе. Каб быць сапраўдным летапісцам нашай эпохі, трэба многае ведаць. І веды гэтыя юнак атрымлівае ў нашым універсітэце. Разам з Анатолем на сваю першую экзаменацыйную сесію прыдзе яго сябра — асістэнт кінааператара Міхась Расінскі, які навучаецца на геаграфічным факультэце. Пажадаем ім нашага студэнцкага: «Ні пуха, ні пяра!».

На здымку: Анатоль Алай гутарыць з артыстам Нікуліным перад здымкай у Мінскім цырку.

В. ПОЛЕК,
студэнт IV курса
аддзялення журналістыкі.

САМАПЛАГІЯТ

Кажуць, хто настойліва стукае ў дзверы, таму заўсёды адчыняюць. Студэнт трэцяга курса аддзялення журналістыкі В. Котаў таксама вырашыў настойліва... пасылаць рэцэнзенту адну і тую ж кантрольную работу. Маўляў, не паставіць залік у першы раз — нікуды не дзенецца, паставіць у другі. Няўжо ён будзе памятаць яе? Але нічога не атрымалася. Рэцэнзент абвінаваціў у самаплагіяце... Зноў незалік!

Дзе выхад? Магчыма, В. Котаў, едучы на сесію, на ўсякі выпадак прыхваціў з сабой у трэці раз тую ж самую карэспандэнцыю «Калектыў дружных», каб атрымаць залік?..

В. ШВЕДАЎ.

І РАДАСНА, І СУМНА

Савецкае крымінальнае права—адна з важнейшых дысцыплін на юрыдычным факультэце. Яна патрабуе грунтоўных ведаў не толькі тэарэтычных праблем, але і кваліфікаванага практычнага падыходу да кожнага пытання. Калі студэнтам стацыянара больш прыходзіцца сутыкацца з тэарэтычнымі пытаннямі, то завочнікам, якія ў большасці працуюць па выбранай спецыяльнасці, шмат прыходзіцца сутыкацца з практычнымі аспектамі гэтай дысцыпліны. Як выявілася на экзаменах, студэнты III курса абмежаваліся толькі вывучэннем заканаўдаўства і вучэбніка. Таму не выпадкова, што са 108 студэнтаў толькі двое здалі на выдатна і 46 на добра. 54 атрымалі здавальняюча. Горш таго, шэсць чалавек здалі экзамены на «нездавальняюча». Прычына крыецца ў тым, што значная частка студэнтаў не выкарыстоўвала манаграфічнай літаратуры і Кіруючыя Пастановы Пленума Вярхоўнага Суда СССР і БССР. Гэта і паклала адмоўны адбітак на адказы ў час экзаменаў.

Нельга не адзначыць выдатныя і добрыя веды такіх студэнтаў, як І. І. Язвінская, З. Н. Майсюк. Але побач з гэтым Е. М. Боранава, З. В. Гайдук, М. Е. Зверау, І. С. Федасеева, А. П. Густоўскі з'явіліся на экзамен з зусім мізэрнымі ведамі. Яны не змаглі адказаць нават на самыя прасцейшыя пытанні курса. І мне нічога больш не прыходзілася рабіць, як ставіць ім нездавальняючыя адзнакі. Хіба можна паставіць добрую адзнаку тым, хто абыякава адносіцца да вучобы.

Сесія ў завочнікаў толькі пачынаецца. Хочацца верыць, што большасць студэнтаў здасць яе на «добра» і «выдатна».

М. МЕРКУШАЎ,
дацэнт.



НЕВЫНОСНАЕ ЖЫЦЦЁ

ФЕЛЬЕТОН

Ні ў трыдзевятым царстве, ні ў далёкім гасударстве, а на філалагічным факультэце жылі-былі дзве студэнткі-завочніцы. Адну з іх звалі В. Буйніцкая, другую—М. Левандоўская, адна вучылася на другім курсе, другая — на трэцім. Невядома, якім шляхам яны трапілі на філфак, але трапілі, трапілі і сталі вучыцца на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры. Жылі яны добра, ад сесіі да сесіі было вельмі весела. Кніжак у рукі браць не прыходзілася, на лекцыі таксама ніхто сілком не гнаў. Мёд, піва пілі, як кажуць, ды гулялі. Так і жылі, жылі і не думалі аб добрай вучобе, больш аб дыпломе думалі.

Але прыходзіла няўмольная пара — сесія, ад якой пачынала кідаць нашых студэнтак то ў жару, то ў холад. Трэба было здаваць экзамены па невядомых для іх прадметах: латыні, уводзінах у нейкае літаратуразнаўства, стараславянскай мове і іншае.

Што ж вы думаеце, здавалі яны экзамены ці не? Ну, вядома, не. Хіба можна іх здаць, не адкрываючы кніжкі.

На першым часе Буйніцкая і Левандоўская не вельмі ўжо адчайваліся.

— Не здалі ў гэтую сесію,— здадзім у другую. Можа павязе?. Дый выкладчык урэшце рэшт падабрэе, — супакойвалі яны самі сябе.

З гэтай пары пачалі вырастаць у іх хвасты. Спачатку кароткія, а пасля з кожнай сесіяй усё даўжэй і даўжэй. З кожнай сесіяй іх флегматычная заспакоенасць парушалася. Жыццё на філфаку для іх становілася усё больш і больш невыносным. Буйніцкую і Левандоўскую пачалі выклікаць у дэканат. Сталі папярэджваць, даваць вымовы...

Бачаць нашы студэнткі — дрэнная справа.

— Давай, — кажа Буйніцкая, — паглядзім, як жывуць хвасцісты на іншых факультэтах.

І з гэтай думкай яны пачалі збірацца ў дарогу. А каб не было сумна, парашылі захапіць з сабой студэнта з аддзялення журналістыкі С. Найдзёнік. Казалі, што ён добрыя мемуары піша, рэпартажы не горшыя, дый як-ніяк журналіст, анекдотамі «травіць» будзе. Ён ахвотна згадзіўся, бо і яму не было жыцця на філфаку. З першага курса не бачыў ніводнай добрай адзнакі ў сваёй залікоўцы, а што датычыцца хвастоў, дык у яго іх хапае, доўгіх і кароткіх — усякіх...

Ці доўга яны хадзілі, ці не — невядома. Але неўзабаве спыніліся перад адным будынкам, дзе было напісана «Біялагічны факультэт». Пакланіліся на ўсе чатыры бакі і паклыпалі па калідорах. Ідуць і чуюць — нехта гарланіць. Прыслухаліся, аж гэта стаяць у музеі завочнікі — біёлагі В. Азарка, Г. Сілкоў, Г. Рабушка. Размахваючы рукамі, яны аб нечым да хрыпаты спрачаюцца.



— Гэта ж асёл, — кажа нехта з іх.

— Сам ты асёл, — крычыць другі, — палічы колькі ў яго зубоў.?! Тады зразумееш, што гэта самае прасцейшае пазваночнае — казёл...

Тут Найдзёнік зразумеў, што спрачаюцца людзі з іхняй «кагорты хвасцістаў» і пачаў пісаць рэпартаж, выкарыстоўваючы іх дыялаг. А Буйніцкая і Левондоўская, добра пазнаёміўшыся з імі, даведаліся, што гэта пяцікурснікі, што ім таксама пачалі наступаць на хвасты. Азарка, Сілкоў, Рабушка з забавальненнем уліліся ў іх працэсію і пашыбавалі на матфак. У адной з аўдыторый яны ўбачылі распацелых, з глыбокадумным выглядам студэнтаў Т. І. Івановіч і П. Пузыновіч. З апошнімі ад бяссоння вачыма яны стаялі перад дошкай, на якой вялізнымі літарамі было штосьці напісана. Перад «буйнымі даследчыкамі» стаяла «нялёгкая» задача — здабыць квадратны корань з чатырох. Які ім паратунак маглі даць Буйніцкая, Левандоўская, Азарка, Сілкоў, Рабушка і Найдзёнік, якія былі «спецыялістамі» у іншых галінах навукі? Яны кінуліся наўцёкі.

Ці доўга яны блукалі ці мала, але неўзабаве іх выклікаў да сябе дэкан. Пасля некатораго ўступа ён паставіў, перад імі наступную ўмову:

— Калі і надалей вы будзеце хадзіць з хвастамі, то прапіскі ва універсітэце не атрымаеце...

А. БАБОКАЎ.

Мікола ПАНАСЮК

Я ЗАЎСЁДЫ ІМКНУЎСЯ БЫЦЬ ПРОСТЫМ...

Я заўсёды імкнуся быць
простым
І правіла ведаць святое:
Жыццё вымяраюць не ўзростам,
А меркаю спраў, дабратою.
Я заўсёды імкнуся сумленне
Звяраць з чысцінёю расінак,
Вачыма сваімі праменіць
Людзям цяплыню штохвілінна.

***

Можа радасць калі абміне,
Будзе шчасце далёкім, як зоркі,
Калі раптам не стане мяне,
Ціхім срэбраным восеньскім
золкам,
Няхай дзень нараджаецца зноў,
Апалосканы ў чыстых
праменнях,
Няхай звонкая песня вясной
Не смуткуе па мне ў задуменні.
А ірвецца ў крыштальны блакіт,
Для палёту другім зычыць
крылы...
Хай расплавіцца зло на вякі.
Як пад сонцам халодныя крыгі.

***

Калі праменне сонца
росы ліжа
І спіны хваль
у рэчцы серабрыць,
Калі на лісцях вербаў,
стромкіх вішань
Лагодны ветрык
раптам прабяжыць.
Люблю жыццё,
асветленае марай,
І новы дзень,
што шчасце прынясе.

БІБЛІЯТЭКА І ЗАВОЧНІК

Бібліятэка нашага універсітэта адна з буйнейшых сярод вну Беларусі. Фонд яе складае больш 800 тысяч тамоў. Такая колькасць кніг адпавядае праграме тых прадметаў, якія вывучаюцца ва універсітэце. У 1966 годзе ў бібліятэцы было зарэгістравана 15000 чытачоў. Штогод студэнтам выдаецца больш мільёна тамоў.

Акрамя студэнтаў стацыянара і вячэрнікаў, паслугамі нашай бібліятэкі карыстаецца 4 437 завочнікаў. Супрацоўнікі бібліятэкі добра разумеюць, што завочнае навучанне — цяжкае і складанае, і яны стараюцца своечасова забяспечыць кнігамі тых, хто ахоплен гэтай формай вучобы. У той час, калі студэнты стацыянара могуць праслухаць падрабязныя лекцыі па таму ці іншаму прадмету, займацца ў чытальных залах і браць кнігі ў іншых бібліятэках горада, студэнты-завочнікі не маюць гэтай магчымасці.

У апошні час укамплектаванне бібліятэкі падручнікамі значна палепшылася. У яе скарбонку паступілі новыя кнігі па псіхалогіі, педагогіцы, навуковаму камунізму, заалогіі, мікрабіялогіі і іншыя выданні. Значную частку гэтых новых кніг атрымалі завочнікі. Але, нажаль, наша бібліятэка не можа яшчэ забяспечыць поўнасцю кожнага патрэбным камплектам дапаможнікаў.

У цяперашні час мы выдаем завочнікам каля 35 — 40 працэнтаў агульнай колькасці падручнікаў. Гэтага было б і дастаткова, калі б усе студэнты своечасова вярталі кнігі. Нажаль, некаторыя з іх затрымліваюць літаратуру на год, а то і на два і больш. Так, з 1964 года і да гэтага часу не вядома, па якой прычыне трымаюць вучэбнікі студэнты В. І. Каробка, С. С. Сідараў, З. А. Пахомава, С .К. Дзенісюк, А. М. Гучок, Н. В. Іванцова і многія іншыя. За парушэнне агульных правілаў карыстання кнігамі падобныя студэнты пазбаўляюцца магчымасці карыстацца паслугамі бібліятэкі. Мала таго, некаторыя недарэчныя студэнты зусім губляюць падручнікі. Толькі за апошнія два-тры месяцы згубілі кнігі больш дзесяці чалавек. Сярод іх Л. Д. Чымбург, В. Д. Латышава, Н. С. Хмель, А. К. Неткачоў і іншыя. Вялікі матэрыяльны ўшчэнт наносяць і тыя гора-студэнты, якія неахайна адносяцца да літаратуры: вырываюць лісты, крэсляць, а то і малююць розныя рэчы. Таму прыходзіцца кожны год спісваць вялікую колькасць кніг.

З кожным годам бібліятэка павялічвае дапамогу завочнікам у міжсесійны перыяд, высылае ім неабходную колькасць літаратуры ў самыя далёкія куткі рэспублікі і далёка за яе межы. Як кажуць, недасягальных для нашага калектыва месц няма. Сотні завочнікаў напісалі кантрольныя і курсавыя работы, атрымаўшы ад нас патрэбныя дапаможнікі.

Калектывам бібліятэкі ўстаноўлена цесная сувязь з дэканатам завочнага факультэта па пытаннях камплектавання літаратуры, барацьбе з тымі, хто абыякава адносіцца да кнігі.

Штогод намі аказваецца дапамога студэнтам-завочнікам па складанню спісаў на падручнікі, запланаваныя выдавецтвам да друку. Тым самым мы арыентуем навучэнцаў на набыццё неабходнай літаратуры ў асабістыя бібліятэкі. З завочнікамі праводзяцца бібліятэчна-бібліяграфічныя заняткі, на якіх яны знаёмяцца са структурай нашай работы, правіламі самастойнага карыстання, каталагамі і бібліятэчнай літаратурай, а таксама дапамагаем выбіраць неабходныя дапаможнікі для напісання кантрольных і дыпломных работ.

А. ДРАЗДОЎСКІ,
супрацоўнік бібліятэкі.

АЛЬБЕРТ КІЙІНДУ

18 студзеня 1967 года раптоўна абарвалася жыццё кангалезскага студэнта падрыхтоўчага факультэта нашага універсітэта Альберта Кійінду.

Тыя, хто ведаў Альберта, памятаюць яго як жыццярадаснага юнака і добрага сябра, энергічнага чалавека, сумленнага і дапытлівага студэнта.

Альберт Кійінду нарадзіўся 6 красавіка 1946 года ў Конга (Бразавіль), у вёсцы Амон.

Паспяхова закончыў школу. Ён марыў стаць інжынерам, каб будаваць масты і дарогі на сваёй роднай зямлі. Альберт ведаў, што яго краіне патрэбны маладыя высокакваліфікаваныя спецыялісты, актыўныя будаўнікі новага жыцця. І таму юнак прыехаў у Савецкі Саюз на вучобу. Прышлося спачатку паступіць на падрыхтоўчы факультэт Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, бо дома не вывучаў рускую мову.

Тут яго цікавіла ўсё, у новай для яго краіне, дзе ён знайшоў сапраўдных сяброў. Аб тым, што ён бачыў, што радавала яго, ён пісаў у сваіх пісьмах бацькам у далёкую Афрыку.

Акрамя французскай, добра ведаў і размаўляў на англійскай і іспанскай мовах. У гэтую экзаменацыйную сесію на выдатна здаваў залікі і экзамены. З самага пачатку навучальнага года ён актыўна ўключыўся ў грамадскую работу. Сваімі ўражаннямі аб савецкай краіне, савецкіх людзях дзяліўся на старонках газеты «Беларускі універсітэт», з'яўляўся членам рэдкалегіі насценгазеты, удзельнічаў у мастацкай самадзейнасці.

Светлую памяць аб ім мы назаўсёды захаваем ў нашых сэрцах.

ГРУПА ТАВАРЫШАЎ.



Студэнты, відаць, нездарма іншы раз гавораць, што пасля паспяховай здачы заліка ці экзамена яны больш ведаюць, чым перад экзаменамі. Магчыма гэта і так. Бо хваляванне пакідае студэнта, больш сістэмна акрэсліваюцца думкі, з'яўляецца бадзёры настрой, які не можа абмінуць і яго таварышаў...

НАРОДНЫ КАНТРОЛЬ ДЗЕЙНІЧАЕ

Вялікую ўвагу і старанне ўдзяляе рэктарат, партком, камітэт камсамола і мясцком паляпшэнню побыту студэнтаў нашага універсітэта, стварэнню ўсіх неабходных умоў для нармальнай вучобы і адпачынку. На маючым адбыцца сёння пасяджэнні групы народнага кантролю будзе заслухана паведамленне прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы А. В. Кірсанава. Ён раскажа аб шматбаковых канкрэтных мерапрыемствах, накіраваных на паляпшэнне жыллёвых умоў студэнтаў.



З кожным годам усё павялічваецца і павялічваецца кантынгент студэнтаў, якія вучацца ў нашым ардэнаносным універсітэце. Паралельна з гэтым расце і сям'я карпусоў вну. На здымку нашага фотакарэспандэнта А. Кадзета вы бачыце дзевяціпавярховы будынак, які 1 верасня гэтага года гасцінна адчыніць свае аўдыторыі і лабараторыі студэнтам.

ІХ ФРАНТАВЫЯ ДАРОГІ

Даўно адшумелі ваенныя гады, гады вялікіх выпрабаванняў для нашага народа. Аб неўміручым подзвігу Радзімы пісьменнікі і журналісты напісалі шмат кніг, нарысаў, артыкулаў. Як збіраліся факты, шматлікія факты гераічнага летапісу? Дзе і ў якіх абставінах пісаліся гэтыя кнігі, нарысы? Кніга «Журналісты на вайне», якая вышла нядаўна з друку, і адказвае на гэтыя пытанні.

Пасівелі ўжо галовы журналістаў-франтавікоў, але створаныя імі паэмы, песні, вершы не перастаюць і ніколі не перастануць хваляваць сэрцы нашага сучасніка. Прачытаўшы старонкі гэтай кнігі, бачыш, што журналісты разам з усімі не раз адпраўляліся ў разведку ў глыбокі тыл ворага, хадзілі ў атаку, лёталі на самалётах, змагаліся ў партызанскіх атрадах і гераічна паміралі за сваю маці-Радзіму.

Кніга знаёміць чытача з цікавымі момантамі ў біяграфіі вядомых пісьменнікаў і журналістаў К. Сіманава, А. Твардоўскага, А. Суркова, В. Кажэўнікава, Б. Палявога і многіх іншых, якія не толькі выступленнямі ў друку, але і асабістым прыкладам натхнялі байцоў на новыя подзвігі ў імя перамогі.

Кніга багата ілюстравана фотаздымкамі вядомых франтавых карэспандэнтаў Г. Амельчука, Я. Рубкіна, Г. Санько, А. Ягорава, Г. Самсонава і многіх іншых. І калі цяпер, праз гады, глядзіш на гэтыя здымкі, сэрца напаўняецца гордасцю за тых, хто з гарачых баёў вырваў і данёс да нас неўміручыя кадры. Вось перад намі І. С. Конеў. Ён вядзе гутарку з пісьменнікамі М. Шолаховым і А. Фадзеевым, здымак зроблены ў 1941 годзе. А гэта, відаць, у прыфрантавым лесе Барыс Гарбатаў чытае сваё апавяданне групе супрацоўнікаў газеты. Перагортваем яшчэ некалькі старонак — А. Твардоўскі на папялішчы свайго роднага дома ў вёсцы Загор'е...

Гледзячы на гэтыя і многія іншыя здымкі, учытваючыся ў кожны радок кнігі, усведамляеш, які гераічны, баявы паход здзейснілі журналісты-франтавікі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Асабліва запамінальныя і цікавыя матэрыялы, у якіх расказваецца аб непахіснай веры савецкага народа ў перамогу ў самыя цяжкія 1941—1942 гады. Не дзіўна, што кніга карыстаецца такой вялікай папулярнасцю ў шырокага кола чытачоў. Шкада толькі, што яна вышла з друку вельмі малым тыражом.

М. РУБАНЕНКА,
студэнт-завочнік шостага курса філалагічнага факультэта.

Рэдактар М. І. ІОСЬКА.

Адрас рэдакцыі: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, І паверх, п. 106, тэл. Б-2-07-19, Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. № 140. АТ 17237